Лідзія МАЛАХАВА

# Каларыстычны вобраз нацыянальнага адзення беларусаў і яго рэгіянальныя асаблівасці

Беларускае народнае адзенне фарміравалася на працягу стагоддзяў, але асноўныя яго віды і састаўныя часткі, спосабы пашыву і кампазіцыйныя рашэнні, а таксама каларыстычныя і арнаментальныя асаблівасці пачалі складвацца з канца XIII ст. адначасова з фарміраваннем беларускай народнасці. Касцюм беларусаў развіваўся поруч з касцюмамі рускіх, украінцаў, а таксама літоўцаў, палякаў і іншых народаў, узбагачаўся іх нацыянальнымі рысамі. Гэтым тлумачыцца шэраг падабенстваў беларускага народнага касцюма з народным адзеннем суседніх народаў як у каларыстычным рашэнні, так і іншых асаблівасцях. Як адзначаюць даследчыкі, у канцы XIX—пачатку XX ст. касцюм беларускіх сялян выступае як традыцыйны, класічны ўзор народнага мастацтва.

Колерная гама беларускага народнага адзення даволі багатая. Яна спалучае ў сабе самыя розныя колеры: сіні, блакітны, фіялетавы, карычневы, белы, чырвоны, чорны. Аднак дамінаванне апошніх трох колераў відавочнае. Вызначаючы прычыну гэтай перавагі, якая характэрна не толькі для беларускага народнага адзення, але і для іншых відаў народнага мастацтва (у прыватнасці, для ткацтва і роспісу), мы далучаемся да думкі доктара філасофскіх навук У.Конана, які сцвярджае, што "тут дзейнічаюць спрадвечныя архетыпы, захаваныя ў мастацкай інтуіцыі народных майстроў. Большасць даследчыкаў згодная з тым, што беларускі народ у сваёй культуры, мове, мастацтве захаваў найчысцейшыя славянскія вытокі, якія сягаюць аж да індаеўрапейскага пранарода. У гэтай "архаічнасці" — найвялікшая каштоўнасць нашай народнай мастацкай спадчыны... Мой вопыт даследавання беларускай міфалогіі дае падставу бачыць у белым, чырвоным і чорным колерах сімвалічную выяву міфалагемы Сусветнага дрэва быцця, дзе бель — жыццядайнае нябеснае святло, чырвань — кроў зямнога жыцця, а чарната — вобраз Хнотнаса, Маці-зямлі, якая спараджае жыццё і хавае яго ў сваім улонні. Усе іншыя колеры і адценні больш позніяя мадыфікацыі гэтых архетыпных, спрадвечных".

Аднак, на наш погляд, бела-чырвона-чорная дамінанта беларускага народнага касцюма вылучалася не толькі гістарычна, яна была выклікана і той сыравінай, што ішла на выраб тканіны і паўплывала на яе якасць і колер, і тымі фарбавальнікамі, якія выкарыстоўваліся для афарбоўкі тканін.

Сярэднекантынентальны клімат беларускага краю вымагаў адносна цёплага і закрытага адзення. Матэрыял для яго давала мясцовая сыравіна — лён, радзей каноплі, воўна. Ніткі і тканіны фарбавалі прыроднымі фарбавальнікамі — настоямі траў, кары, лісця, шышак, балотнай жалезнай рудой. Ільняныя тканіны, з якіх выраблялiся кашулі, фартухі, галаўныя ўборы, не фарбаваліся. Белае палатно



*МАЛАХАВА Лідзія Алегаўна — дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, навуковы супрацоўнік навукова-творчай лабараторыі "Традыцыйныя рамёствы беларусаў". Нарадзілася ў Мінску. У 1981 г. скончыла прыкладное аддзяленне Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута па спецыяльнасці "мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва". Даследуе народнае мастацтва Беларусі. Займаецца вывучэннем і адраджэннем тэхнік і тэхналогій беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Аўтар 15 навукова-папулярных артыкулаў.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аздаблялі арнаментам, які рабілі натыканнем ці вышыўкай. У старажытнасці чырвоны колер сімвалізаваў жыццё, а нанесены з дапамогай арнаменту на каўнер, разрэз пазухі, ніз кашулі служыў засцерагальным знакам. Ён жа адыгрываў істотную кампазіцыйную ролю, аб'ядноўваючы часткі адзення ў мастацкае цэлае. Паліхромнасць уласціва суконным і паўсуконным тканінам адзення, якое падпяразваецца, а таксама поясу. Тут вышыўка амаль што адсутнічае, а тканы ўзор вызначаецца сакавітасцю тонаў, смеласцю іх спалучэнняў — чырвоны, зялёны, сіні, белы. Удала выкарыстоўваюцца ў аздобе касцюма натуральныя серабрыстыя тоны льну і воўны. З другой паловы XIX ст. са з'яўленнем анілінавых фарбавальнікаў спектар колераў дапоўніўся аранжавым, фіялетавым, блакітным, малінавым, ярка-зялёным. Аднак сфера іх выкарыстання была абмежавана.

Што тычыцца колернай гамы беларускага народнага адзення, то яна была разнастайная. Каларыт мужчынскага касцюма адрозніваўся ад жаночага. Мужчынскі касцюм меў сціплае аздабленне. У ім пераважаў белы колер, а чырвонае ці чырвона-чорнае аздабленне ўпрыгожвала каўнер, пазуху, падол кашулі, а часам верх і ніз рукавоў. Штаны ўвогуле былі аднатонныя: шэрыя, карычневыя, сінія. Самай маляўнічай часткай мужчынскага касцюма быў рознакаляровы пояс з кутасамі. Найбольшага ўзлёту фантазіі і майстэрства ў аздабленні беларускае адзенне дасягнула ў жаночым касцюме. У аздабленні святочнага адзення гарманічна спалучаліся ткацтва, вышыўка, карункапляценне, аплікацыя, набойка.

Калі не браць да ўвагі некаторыя рэгіянальныя варыянты, практычна па ўсёй Беларусі ў комплекс жаночага адзення ўваходзілі кашуля (сарочка), спадніца (андарак, бурка), фартух (пярэднік), безрукаўка (гарсэт, кабат, шнуроўка), а таксама галаўны ўбор і верхняе адзенне. Верхняя мужчынская і жаночая вопратка мала адрознівалася паміж сабой. Яе шылі з валенага нефарбаванага сукна (світа, сярмага), што вызначала белы ці шэры колер, або з аўчыны (кажух, кажушок, казачына). Кажухі звычайна былі белыя ці чырвона-вохрыстыя. Дэкаратыўнасць найбольш выяўлялася ў святочных світах, якія ўпрыгожваліся шнурком, аплікацыяй, вышыўкай.

Аснову жаночага касцюма складала бялюткая палатняная кашуля з чырвона-чорным узорам на верхняй частцы рукавоў, каўнерыку, манжэтах, паліках. Белы быў і фартух, аздоблены па падоле адной ці некалькімі палосамі таго ж дэкору, што і на кашулях. Як бачым, белы колер у народным адзенні Беларусі дамінуе, што дало падставу некаторым вучоным сцвярджаць, быццам адсюль і паходзіць назва "беларусы". Мы дапускаем такую гіпотэзу, паколькі адзенне суседніх народаў такой белізной не адзначаецца. У пачатку XX ст. фартухі часта аздабляліся вышыўкай, аплікацыяй з фабрычных тканін, карункамі, кутасамі.

У адрозненне ад палатняных кашулі і фартуха андарак звычайна шылі з афарбаванай ільняной ці шарсцяной тканіны, вытканай у клетку белага, чырвонага, зялёнага колеру па чырвонаму, вішнёваму, чорнаму фону. Часта андаракі, асабліва будзённыя, мелі аднатонную афарбоўку, але таксама яркую — вішнёвую, зялёную, сінюю, фіялетавую. У цэлым яны складалі яўны колерны кантраст стрыманаму бела-чырвонаму каларыту кашуль і фартухоў.

Вялікай разнастайнасцю дэкору вызначаюцца гарсэты, хоць абавязковым кампанентам касцюма яны былі не ўсюды: у некаторых вёсках на захадзе Брэстчыны, Гомельшчыны, Віцебшчыны, Магілёўшчыны іх не насілі. Шылі гарсэты звычайна з пакупных тканін яркіх колераў: чырвонага, зялёнага, сіняга, бардовага, часта чорнага, але з яркай вышыўкай ці аплікацыяй. Для вышыўкі разам з шарсцянымі, шаўковымі ніткамі яркіх колераў ужывалі нават залатыя ніткі, дадавалі металічныя бліскаўкі, шклярус і іншае.

Завершанасць і святочнасць жаночаму касцюму надавалі самыя разнастайныя галаўныя ўборы з багатай колернай гамай. Дзяўчаты заплятаді косы, упляталі ў іх каляровыя стужкі, насілі вянкі з натуральных і штучных кветак, вузкія ручнікі-скіндачкі бела-чырвонага каларыту, а таксама разнастайныя абручыкі з лубу ці паперы, упрыгожаныя яркімі кветкамі, тасьмой, стужкамі, птушыным пер'ем. Замужнія жанчыны старанна хавалі валасы пад галаўным уборам, самы характэрны і старажытны — намітка, што нагадвае ручнік з кужэльнага палатна.

Будзённым абуткам жанчынам служылі лапці, святочным — скураныя пасталы і чорныя хромавыя чаравікі.

Прадстаўленае апісанне дае толькі самую агульную характарыстыку колернага аздаблення святочнага жаночага адзення. Яго ж колерная гама, як і вобраз, розніліся не толькі ў кожным рэгіёне, але часам нават і ў суседніх вёсках, асабліва на Палессі. Так, на захадзе Брэсцкага Палесся (Кобрынскі, Жабінкаўскі, часткова Камянецкі раёны) жаночае адзенне вызначалася арнаментальным багаццем і адначасова каларыстычнай стрыманасцю і завершанасцю. Тканы ці вышываны ўзор насычанага чырвонага колеру з дробных геаметрычных элементаў спалучаецца з вузкімі палосамі звычайна аднолькавай шырыні, якія раўнамерна ўкрываюць усю паверхню рукава ўздоўж ці ўпоперак. Такія ж палосы гарызантальна размешчаны і па ўсяму фартуху. Андаракі — чырвоныя ці цёмна-сінія, стрыманага каларыту і арнаментыкі. Завершанасць і велічнасць жаночаму адзенню надавала беласнежная намітка, аздобленая па краях далікатным узорам, паяском чырвонага колеру, каб "ахоўваць" галаву.

На паўднёвым захадзе Брэсцкага Палесся (Маларыцкі раён, часткова Брэсцкі) у жаночым касцюме дамінуюць матэрыялы натуральна колеру з ільну, каноплі, воўны. Асаблівы серабрысты каларыт арганічна спалучаецца з насычаным цёмна-чырвоным арнаментам. Шырокія арнаментальныя палосы запаўняюць верхнюю частку рукавоў і амаль што ўсё поле фартухоў. Такі ж дэкор укрывае тоўстыя бела-шэрыя шарсцяныя спадніцы (буркі), прычым самая шырокая паласа ідзе па нізе, кожная наступная — больш

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

вузкая, як і на фартуху. Такая кампазіцыя надае касцюму зрокавую ўстойлівасць і манументальнасць.

На Усходнім Палессі насычанасць арнаменту прыкметна змяншаецца, дасягаючы вытанчанай далікатнасці ў Іванаўскім раёне. Вузенькія, амаль што безузорныя палоскі арнаменту размяшчаюцца толькі на плечыках, манжэтах, па нізе фартуха. Гэту суцэльную белізну ажыўляюць гарсэты з яркай пакупной тканіны, аздобленыя вышыўкай і аплікацыяй. Спадніца звычайна аднатонная, чырвоная; шырокі вязаны пояс з доўгімі махрамі выдзяляецца на белым фартуху.

На Гомельскім Палессі больш прыкметна раслінная арнаментыка, якая нясе з сабой паліхромнасць. Для поўначы Гомельшчыны (Калінкавіцкі, Светлагорскі раёны) яна можа быць традыцыйнай чырвона-чорнай і чаргавацца з буйнымі рамбічнымі матывамі. У памежных раёнах з Украінай адзенне пачынае красавацца ўсімі фарбамі. Вышываныя крыжыкам ці больш познім відам вышыўкі — гладдзю рознакаляровыя раслінныя ўзоры ўпрыгожваюць рукавы кашуль, фартухі, пераходзяць на хусткі, аздабляюць кароткія гарсэты блакітных, бардовых, сініх, чорных колераў.

У жаночым адзенні на ўсходзе Беларусі пераважае белы колер. Тут нават вышывалі белымі ніткамі на белым фоне. Андаракі прышывалі да кароткага гарсэта, часцей насілі саяны, падобныя на сарафаны

Адзенне Паўночнай Беларусі ў дэкаратыўных адносінах больш сціплае і стрыманае. Арнаменту няшмат, затое тут сустракаецца набіваны дэкор сіняга колеру. Заўважаецца моцны ўплыў гарадской моды. У канцы XIX ст. старажытныя наміткі выцеснілі хусткі, а потым выйшлі з ужытку і іншыя кампаненты адзення, таму сустрэць тут сёння традыцыйны народны касцюм амаль што немагчыма.

Традыцыйнае народнае адзенне кожнага з шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі (Заходняе і Усходняе Палессе, Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Паазер'е) мае сваю каларыстычную раскладку (колерную гаму з дамінантай). Комплексы адзення гэтых рэгіёнаў (строі) таксама маюць шэраг разнавіднасцей, якія ўвасабляюць стылёвыя прынцыпы народнай творчасці ў пэўных кутках беларускага краю. Яны адрозніваюцца як асобнымі элементамі касцюма, спосабамі іх нашэння, тэхнікай выканання, характарам і сюжэтам арнаменту, так і агульным каларытам касцюма. Геаграфічныя межы народных strояў выражаны нярэзка, у розныя часы яны мяняліся і залежалі ад многіх умоў.

Для таго каб больш поўна ўявіць колернае багацце беларускага адзення, прааналізуем некаторыя са строяў з пункту гледжання іх каларыстычнай каштоўнасці і паспрабуем у кожнага вывесці колерную дамінанту, прыняўшы ўвесь каларыт касцюма за 100% і вылічыўшы працэнт асноўных колераў. Зразумела, што пры наяўнасці мноства варыянтаў колернага аздаблення народнага адзення, такі нескладаны матэматычны падлік будзе прыблізны, не зусім дакладны.

Найбольш вывучаныя строі дамачаўскія, кобрынскія, маларыцкія, мотальскія, пінска-івацэвіцкія (Заходняе Палессе), брагінскія, давыд-гарадоцка-тураўскія, калінкавіцкія, турава-мазырскія (Усходняе Палессе), буда-кашалёўскія, краснапольскія, магілёўскія, неглюбскія (Падняпроўе), вілейскія, капыльска-клецкія, ляхавіцкія, пухавіцкія, слуцкія (Цэнтральная Беларусь), ваўкавыска-камянецкія, мастоўскія, навагрудскія (Панямонне), дубравенскія, лепельскія (Паазер'е). Зробім каларыстычную раскладку некаторых з іх.

Дамачаўскія строі бытавалі ў ваколіцах Дамачава, Брэсцкага, Маларыцкага раёнаў, на тэрыторыі Польшчы і ў паўночна-заходніх раёнах Валынскай вобласці. Жаночы касцюм складаўся з белай кашулі, багата аздобленай малінавым арнаментам з украпваннямі чорных гладкіх пункцірных палос на плечавой устаўцы, верхняй і ніжняй частках рукава. Спадніца і фартух вылучаюцца адным каларыстычна-арнаментальным вырашэннем. Усё поле спадніцы запаўнялі чырвоныя, зялёныя, белыя, блакітныя, чорныя падоўжаныя ці папярочныя палосы. Гарсэты былі цёмна-карычневыя ці блакітныя, багата аздобленыя рознакаляровымі тасёмкамі, стужкамі, гузікамі, дэкаратыўнай строчкай. Галаўны ўбор — рознакаляровы, але абавязкова прысутнічаў чырвоны колер.

Працэнтныя адносіны колераў: белы — 25%, чырвоны, малінавы — 40%, чорны — 5%, блакітны — 20%, зялёны — 5%, іншыя колеры (жоўты, карычневы) — 5 %. Увогуле дамачаўскія строі характарызуюцца паліхромнасцю, сакавіта-мажорнай напружанасцю каларыту, чырвонай дамінантай.

Кобрынскія строі бытавалі ў XV—пачатку XX ст. пераважна на тэрыторыі Жабінкаўскага і Кобрынскага раёнаў. Складаліся з белай кашулі з чырвона-малінавым арнаментам з невялікімі ўкрапваннямі чорнага ці цёмна-сіняга колеру, што збіраўся ў вузкія, аднолькавай шырыні шлячкі, якія ў падоўжаным ці папярочным кірунку запаўнялі ўсю паверхню рукавоў, з белага фартуха з тым жа колерным аздабленнем, што і кашуля, з серабрыста-белай ільняной спадніцы або чырвонага, радзей чорнага ці цёмна-сіняга андарака з белымі, зялёнымі, сінімі, фіялетавымі прасноўкамі, з рознаколернага пояса і са звычайна белага з чырвоным арнаментам галаўнога ўбора.

Працэнтныя адносіны колераў: шэры, белы — 45%, малінавы, чырвоны — 45%, чорны — 5%, зялёны, сіні, фіялетавы і іншыя — 5%. У цэлым кобрынскія строі характарызуюцца даволі стрыманай колернай гамай з бела-чырвонай дамінантай. Гэта дамінанта характэрна і мотальскім, калінкавіцкім строям.

Пінска-івацэвіцкія строі бытавалі ў XIX—сярэдзіне XX ст. у Бярозаўскім, Ганцавіцкім, Драгічынскім, Івацэвіцкім, Пінскім раёнах. Ім уласціва серабрыста-белая каларыстычная гама: белая кашуля з дробнымі арнаментальнымі чырвонымі, чырвона-чорнымі палоскамі і белы фартух з тым жа аздабленнем, чырвоны, фіялетава-сіні андарак ці белая спадніца з чырвонымі вузкімі паскамі; цёмна-карычневы ці сівы кабат; белы ці бела-чырвоны галаўны ўбор.

Працэнтныя адносіны колераў: белы — 70%, чырвоны — 15%, чорны — 9%, карычневы, фіялета-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вы, сіні, зялёны і іншыя — 6%. Як бачым, перавага белага колеру сумнення не выклікае.

Для брагінскіх строяў, якія бытавалі пераважна ў паўднёва-ўсходніх раёнах Гомельшчыны, характэрны белая кашуля з багатым арнаментальным аздабленнем чырвонымі, чорнымі і белымі ніткамі на рукавах, плечавых устаўках, каўняры і падоле; рознакаляровы фартух; андарак, гладкафарбаваны, найчасцей чырвона-малінавы або затканы падоўжанымі белавохрыстымі палоскамі ці вышыты па нізе белымі, вохрыстымі, зялёнымі, сінімі, чорнымі ніткамі; даволі разнастайныя па колернай гаме галаўныя ўборы.

Працэнтныя адносіны колераў: белы — 20%, чырвоны — 30%, чорны — 20%, вохрысты — 10%, сіні і зялёны — 15%, іншыя — 5%. Брагінскія строі вызначаліся багаццем колераў, некаторай стракатасцю.

Давыд-гарадоцка-тураўскія строі бытавалі ў асяроддзі мяшчан невялікіх гарадоў (Тураў, Давыд-Гарадок, Столін), мястэчак і буйных вёсак у XIX— пачатку XX ст. Рэзка вылучаўся сярод іншых строяў шырокім выкарыстаннем мануфактурных тканін, каштоўнымі ўпрыгажэннямі. Кашуля звычайна была белая, радзей іншых колераў, аздобленая раслінным або расліннa-зааморфным арнаментам у чырвона-чорнай гаме ці без яго. Спадніцу шылі з даматканага гладкафарбаванага цёмна-сіняга або чырвона-бурачковага сукна ці з фабрычнай зялёнай, чорнай або цёмна-сіняй тканіны. Гарсэт мог быць чырвоны, фіялетава-сіні і іншага колеру з узорам і без яго. Фартухі шылі з фабрычных тканін цёмных аднаколерных тонаў або са стракатым набіваным раслінным узорам. Падпяразваліся чырвона-бардовым ці рознакаляровым поясам; тураўлянкі завязвалі пояс з залацістай парчы — галуну. Рознакаляровасцю вызначаліся і галаўныя ўборы.

Такая варыянтнасць аздаблення стварае вялікія цяжкасці ў вызначэнні колернай дамінанты. Можна толькі адзначыць, што ў лік колераў давыд-гарадоцка-тураўскіх строяў уваходзілі белы, чырвоны, сіні, зялёны, чорны. Ім уласціва гарманічнае спалучэнне кантрастных чырвона-зялёных колераў.

Тыповым для буда-кашалёўскіх строяў з'яўляецца белая кашуля з чырвона-чорным арнаментам, чырвона-чорны андарак ці палатнянік, белы фартух, чорны ці цёмна-сіні гарсэт.

Працэнтныя адносіны колераў: белы — 40%, чырвоны — 20%, чорны — 35%, іншыя (зялёны, жоўты) — 5%. Буда-кашалёўскія строі вылучаюцца бела-чорнай дамінантай.

Пухавіцкія строі бытавалі ў XIX—пачатку XX ст. на тэрыторыі паміж Слуцкам і Асіповічамі. Яны складаліся з белай кашулі з чырвоным ці чырвона-чорным арнаментам, з фартуха той жа колернай гамы, рознакаляровай спадніцы (малінавага, васількавага, бурачковага, фіялетавага, чорнага, белага колеру), чорнага ці васількавага гарсэта з рознакаляровым аздабленнем.

Працэнтныя адносіны колераў: белы — 40%, чорны — 7%, чырвоны, бурачковы — 10%, блакітны, фіялетавы — 40%, іншыя колеры — 3%. У пухавіцкіх строях пераважаў блакітна-белы колер.

Даследчыкі беларускага народнага мастацтва сыходзяцца на думцы, што мелодыя беларускага народнага адзення шматгалосая. Аднак і ў гэтым шматгалоссі ёсць тое агульнае, што вызначае яго. І гэта не што іншае, як чырвона-бела-чорная дамінанта, якая, як адзначалася раней, увасабляе спрадвечныя архетыпы.

У цэлым, калі разглядаць усю колерную гаму народных строяў, то складваецца ўражанне, што ў іх пераважае не белы, а чырвоны колер і розныя яго адценні ў спалучэнні з белым, сінім, зялёным, аліўкавым, карычнева-бэжавым, фіялетавым, аранжава-жоўтым. Чырвоны, белы, чорны колеры сустракаюцца ва ўсіх строях. Але іх прапорцыі розныя, найбольш актыўны ў кобрынскіх строях — чырвоны. Значную долю ў буда-кашалёўскіх, мазырскіх строях складае чорны колер. Такую акалічнасць цікава растлумачвае У.Конан, прыводзячы меркаванні багасловаў-евангелістаў: "Бог ёсць святло і няма ў ім ніякай цемры". Чырвань, безумоўна, выяўляе крыніцу касмічнага святла — нябесны агонь, сонца і зоркі. Але і зямля — Боскае тварэнне: спараджаючы зялёны расліны Свет, яна ўзгадвае і падтрымлівае жыццё".

Аналізуючы асобныя строі, даследчыкі прыходзяць да высновы, што адзенне людзей таго ці іншага рэгіёна адпавядае прыроднаму наваколлю. Народны касцюм Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі больш стрыманы па колеры, чым адзенне Палесся. Тое ж самае тычыцца і ўвогуле каларыстычнага вобраза ўсяго беларускага народнага адзення. Акрамя чырвонага, белага і чорнага колераў даволі вялікая доля адводзіцца зялёнаму і сіняму. Зялёны колер у беларускім фальклоры нават абрадавы. Так, абрадавы касцюм вясенне-летняга цыкла з ужываннем зеляніны павінен быў спрыяць урадлівасці. Колерны дэкор касцюма беларускіх сялян натуральна ўпісваўся ў беларускі краявід, гарманіраваў з інтэр'ерам сялянскай хаты з яе самабытнай мэбляй, ручнікамі, дыванамі, абрусамі.

Колер у адзенні беларусаў адыгрываў не толькі эстэтычную, але і сакральную ролю. У пост, напрыклад, апраналі адзенне без чырвані, так званае поснае. У жалобе жанчыны надзявалі чорны галаўны ўбор, часам і адзенне таго ж колеру.

Падагульняючы разгляд колерных асаблівасцей беларускага народнага адзення, адзначым, што каларыт касцюма звычайна складаўся з сакавітых, часта кантрастных колераў, не толькі спектральных і ахраматычных, але і змешаных. У цэлым каларыт беларускага народнага адзення можна вызначыць як мажорны.

**Літаратура**

Конан У. Магія красы // Мастацтва Беларусі. 1996, № 6; Лабачэўская В.А. Зберагаючы самабытнасць. З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі. Мн., 1998; Маленка Л.У. Беларускі народны касцюм. Мн., 2001; Раманюк М. Беларускае народнае адзенне. Мн., 1981; Сахута Я.М. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Т. 8. Беларусы. Мн., 2005; Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ